# ВРЕДИНА

№ 1




БЕЗЫДЕЙНЫЙ ЖУРНАЛЬЧИК?

восень 2001

## ОТ РЕДАКЦИИ



Есть такая традиция: перед тем, как начать делать зин, учредители определяют его концепцию или хотя бы общую направленность. Так вот - туго у нас с этим.

Очень уж мы разные.

Нам не хотелось делать музыкальный зин, но и загружать тебя позитивными идеями тоже было в лом.

В итоге получилось то, что получилось.

Яніна и Алексей.



## Ода светлому будующему



Я уж было совсем отчаялся, затосковал по "старым добрым временам". Думал, никогда нам больше не знать романтики в сердце и зубов на полке - а значит и жизнь не так уж весела.

Ну что за жизнь без борьбы? Что за жизнь без очередей и дефицита? Где набраться мужества и не реветь как белуга от обиды за то, что наши славные деды и прадеды познали всё, имели возможность развлекаться в очередях, узнавать там же все новости ( мирового масштаба даже!), запечатлели всю эту романтику в фильмах. А теперь показывают нам - дразнят! Вот, мол, как нам было весело жить на свете! А вы, зелень-переростки, так и не познаете всех тех прелестей, что были доступны нам!



Раньше у всей страны было общее, всеобъединяющее хобби - "найти-выстоять-достать". А теперь всё есть, и расползлись вы, молодёжь, по разным углам, интересуетесь всякой всячиной, и не понять вам уже того кайфа, что получаешь от общения со всей Огромной Страной сразу во всеобщем порыве: "достать дефицит".

Но вот пришло жаркое лето, созрели плодово-ягодные, фруктово-овощные и прочие звери - и я был послан в магазин за сахаром. Без особого энтузиазма я направил свои стопы в ближайший гастроном. На моё удивление, сахара там не оказалось, хотя обычно там есть всё, что нужно и не нужно человеку для существования в этом мире.

Сунулся во второй, в третий - опять тот же облом и дикая радость. Времена возвращаются! Романтика на месте!! Всё классно!!!

Вот уже второй день я сижу возле какого-то магазина, где ещё вчера пообещали с минуты на минуту привести сахар. Рядом со мной сидят такие же счастливые люди и общаются: возмущаются, обсуждают погоду и соседей, спорят о политике, в общем - ЖИВУТ! Уже второй день я знаю всё, что происходит в мире, моя жизнь наполнена смыслом, я чувствую себя членом замечательного общества - народа белорусского!

В заключение, могу порадовать себя и окружающих великолепной мыслью, пришедшей мне в голову - ЭТО ТОЛЬКО НАЧАЛО! Скоро пропадёт соль (надо же солить огурцы!), потом детское питание (чтобы наше будующее было здоровее!), потом придёт очередь молока, хлеба, овощей - и снова настанет рай в Беларуси, народ опять объединится, как 10 - 70 лет назад, и будем мы снова жить счастливо, потому что у каждого из нас всегда будет, чем заняться.

ДА ЗДРАВСТВУЕТ СВЕТЛОЕ БУДУЮЩЕЕ! УРА, ТОВАРИЩИ!!!

Июль 2001 г.
АЛЕКСЕЙ





# СУБЪЕКТИВ

## CURRENT 93

Очень сложно писать мне, критику по жизни, о том, что нравится.

Музыка, ускоряющая ритм сердца. Похоже на то, когда самовыражаешься в чём-то,- картина, скульптура, сценарий к спектаклю и т. п. - кому что катит.

Наверное, если делать две эти вещи одновременно - повылетают пробки от напряжения - не пробовал.

АЛЕКСЕЙ



Для пачатку крыху канкрэцікі: я буду казаць пра альбом CURRENT 93 ``HEYHO``Pt. II, Аляксей жа выказваўся пра ўсю іх творчасць агулам.

Зыходзячы з таго, што напісаў А., можна падумаць, што C.93 - нейкая хуткая, рытмічная музыка. Гэта ня так. Справа ў тым, што рытм сэрца не паскараецца, проста яно часам ўздрыгвае ад салодка-гаркавага чаканьня... сустрэчы, дарогі, каханьня з трагічным канцом, свабоды, кароткага, усеабдымнага шчасьця, сьмерці; таго, чаго зараз няма ў тваім жыцьці.

ЯНІНА

Бред какой-то. Играют одно, мужик поёт что-то другое сам себе. Я кассету включил, пять минут послушал и отложил в сторону. Она потому и потерялась.

АНДРЕЙ ПОСТОРОННИЙ



**НАБОРЩИК:** Эй, чуваки! Да определитесь же вы наконец! Я нифига не понял из вашей болтовни!

## 18.07.01, клюб "Тоннель". Больш-менш паслядоўныя думкі пра падзею.

Спачатку быў аблом. Першапачаткова сэйшн павінен быў адбыцца 13.07.01, звацца "Шэршань", праходзіць на прыродзе ўсю ноч і мець статус фестываля з усімі выцякаючымі вынікамі. На жаль, вадзіцелі аўтобусаў аказаліся буржуямі і запатрабавалі грошы за праезд. Сэйшн перанеслі ў Менск на 18.07.01.

У канцы - таксама аблом. Заяўленыя STEREO NOIZE GALLERY, PRUS і В. Акудовіч адсутнічалі (дакладней, Акудовіч, здаецца, быў, але не выступаў).

"Тоннель" сустрэў нас пошукамі нелегальнага піва (кажуць, ёсьць такая прыкмета: калі "шукаюць", то ў бары ня будзе айчыннага прадукту). З гэтай нагоды ў мяне адразу і да канца ўсталяваўся прыкольны настрой, бо я зь дзяцінства піва цярпець не магу, а Аляксей увогуле "незарэгістраваны" SxE.

Дзейства пачалося недзе ў 18.30 з Улада Бубена ды кампаніі. Змрочны хрып-роў, які радуе душу, прымушаў вібрыраваць усе перапонкі цела. Захацелася набыць "Мумії сусьлікаў". Першую песьню Бубен прысьвяціў грамадзянскай вайне, якая





хутка будзе ў Беларусі.

++Ганаровыя піянеры яшчэ існуюць! Па зале хадзіла дзяўчына па-за піянерскага ўзросту ў чырвоным гальштуку. Было прыкладна 50 чалавек і, адпаведна, шмат кіслароду, які актыўна зьнішчалі цыгарэтамі. Зьлева ад Лёшы сядзела жанчына, гадоў пад сорак, і глядзела ўлюбёнымі вачыма маці на Бубена. Справа ад мяне - хлопец панкаўскага выгляду, з Чэ Геварай на майцы і поглядам незразумелага паходжаньня й значэньня.++

KRITCHEV vs BAN. на падлозе разасл͏алі папяровыя дарожкі са словам ZVUUK ZVUUK ZVUUK ZVUUK ZVUUK

Над кампьютэрам павесілі жалезны абаранак, у які часам білі. Прамільгнула думка: "Тэтак і арытмію зарабіць нядоўга". Потым зьявілася нянавісьць да аўтамабіляў.

Пад такую музыку (увогуле, усю) трэба танчыць, але было надта горача й лянота. Шкада, што з жалезнага абаранка не сыпаліся іскры.

Афіша казала, што будзе прэзентацыя 1-га, 2-га, 3-га. Асабіста я ішла на "Шэршань". Але тут нам нарэшце растлумачылі, што прыйшлі мы на "Сьцюдзёную менскую зіму". Адкуль такая назва? Арганізатарам нехта наплёў, што пасьля 9.09.01 больш ня будзе ні восені, ні зімы, ні лета, увесь час будзе толькі вясна. Яны дурненькія паверылі, спалохаліся і вырашылі адзначыць Новы год зараз, пакуль яшчэ не забаранілі.

І быў Жыбуль, і было слова. Нават шмат слоў. Мне вельмі спадабалася, а вось астатняя публіка пакутавала на разнагалосьсе, што мяне, шчыра кажучы, зьдзівіла.

Віктар быў у цяльняшцы і выклікаў цёплыя міцькоўскія пачуцьці.

Праект Ул. Бубена і Іл. Сіна "KEIN". Роў чорны Сін (напэўна). Хтосьці ў нечым (сярэдняе паміж адзеньнем муміі і ўціхамірвальнай кашуляй) белым курчыўся на падлозе. Чорны таксама выглядаў не статычна. У гэты час збоку ад іх гайдаўся экран са зьвілістымі, пераменлівымі мордамі скульптур.

У рэшце рэшт, белага вынесьлі. Alles. Ende.

A-Lex. Добра. Найбольш даступна. Бубен і таварыш пачалі танчыць. Ініцыятыву не падтрымалі, але было чуваць скандзіраваньне: "Бубен лучше всех!"

Андрэй Апановіч. Чытаў лімерыкі. Ня ведаю, неяк аднастайна, нудна. Але апошні верш "Бу" спадабаўся ( бу-бу-бу-бу-бу-бу!)

Зьміцер Вішнёў (і, пэўна, "Брыгада Афрыканскіх Братоў"). Вішнёў крычаў і цягнуў за сабой свіную галаву (сапраўдную). За ім паўзьлі 2 прыдуркі. Перыядычна ўсе трое гэтую галаву тыпа елі. (Лёшу так скрывіла, што думала- прыйдзецца выводзіць яго на сьвежае паветра).

++Час ад часу па зале дэфілiравала дама ў "саламяным" капялюшыку.++

?Праект Ул. Бубена і Зьм. Вішнёва AFRYKOZY "Мумії сусьлікау"? Па словах Лёшы (сама не пачула), В. гарлапаніў: "Дедушка Лёня". Потым нешта роў Б. Прапаную запрасіць у Менск шамана з поўначы Сібіры, думаю, Уладу зь ім будзе аб чым пагаманіць.

KARAOKE VOMIT. Калі хто ня ведае, у гэтым калектыве ёсьць Вова. Дык вось, дзякуй яму вялікае! Сьвятла- й нятолькісьвятламузыка нібы казала: "Адарвіся ад лаўкі!" - народ не павёўся.

Дзесьці ў палове дзесятага нам сказалі: "Вось і ўсё. Калі ласка, вызвальце памяшканьне, тут яшчэ прыбрацца трэба".

P.S. магчыма, я нешта не пачула, выдумала (ненаўмысна), забыла. Дык я ж не кампьютэр, нават не прэтэндую!

Яніна.



## 18.07.01,- тот же клуб "Тоннель". Просто впечатления, без намёка на систематизацию.

Радуюсь несказанно, что Янина первая набралась мужества описать "как всё это было", даже с предысторией. Честь ей за это и хвала, ведь мне теперь долго трудиться и вспоминать очерёдность происходившего не придётся - вот такой я лентяй!

Из собственных ощущений: наконец-то я познал на собственной шкуре, что значит выражение "чувствовать задницей" - слушал музыку преимущественно сидя на полу, ощущая всем телом вибрацию зала.

Не всё на этом празднике жизни лилось бальзамом в измотанные и немного повявшие от жары уши. Синовское разбивание лампочки и скотч - хорошо, но не выношу повторений. Первое моё знакомство с перфоменсами началось именно с синовской лампочки, но в отличие от первого раза, сердце не ушло в пятки от животного страха - а жаль!

Весьма порадовал Жибуль. Думаю, что обломы с разноголосьем возникли только оттого, что большинство народа пришли на дискотеку и были озадачены тем, что происходило на самом деле. Девушка, которая, по мнению Янины, смотрела на Бубна глазами матери, кажется, просто сильно парилась от невозможности нормально потанцевать и пофлиртовать с "нормальными парнями".

Аритмия, которую так вначале боялась заработать Янина, была исцелена A-Lex-ом сразу после Сина. Попытка танцев была мрачнейшей - опять жара виновата? Или же просто народу энергии не хватает? Что, уж без столпов и не можем сами ничего сделать? Только жаловаться умеем - не пришли, бросили нас, маленьких! Позор всей честной компании!

Лимерики А. Апановича - тут уж парился я. И если бы не "Бу" - был бы полный ... не люблю ругаться.

Вишнёв со свиной головой был не так уж плох, как может показаться со слов Янины - меня от удовольствия скривило!

Пилюлю подсластили KARAOKE VOMIT, хорошо, что они оказались в самом конце, хотя Вовка обещал, что где-то после Сина. Может записаться в фанаты, раз уж со SxE не получилось? (шучу).

Вот и всё. Меня мало волнует, что можно подумать о сейшне с моих слов - кто там был, уже сделал для себя выводы, а кто не был, тому ничем помочь не могу - а я проведённым вечером в общем остался доволен.

Алексей.





СУБЪЕКТИВ



## ПАЧУЦЦЁ ЭЛІТАРНАСЦІ

У ПАЧАТКУ ВЕРАСНЯ 2001 ПРАХОДЗІЎ ПАКАЗ КІРГІЗСКАГА КІНО. Я ПРЫСУТНІЧАЎ НА ЯГО АДКРЫЦЦІ. БЫЛО НЯШМАТ ЛЮДЗЕЙ, ШТО МЯНЕ МОЦНА ЗДЗІВІЛА, БО ЎВАХОД БЫЎ ВОЛЬНЫ.

ЯК І ЗАЎСЁДЫ, Я ЗАНЯЎ СВАЁ ЛЮБІМАЕ МЕСЦА - ПАСЯРЭДЗІНЕ ПЕРШАГА РАДА. ВАКОЛ МЯНЕ КОДЗЯЦЬ РОЗНЫЯ ЛЮДЗІ, ТЫЯ, ШТО ПРЫ ГАЛЬШТУКАХ - СЯДАЮЦЬ ТАКСАМА Ў ПЕРШЫМ РАДЗЕ. АЛЕ ІХ ВЕЛЬМІ МАЛА, І АМАЛЬ УВЕСЬ РАД СВАБОДНЫ.

А 6-АЙ ГАДЗІНЕ (НЕ РОЎНА) НА СЦЭНУ ЎЗЫХОДЗІЦЬ ПАСОЛ КЫРГЫСТАНА „И ИЖЕ С НИМ". НЕЗРАЗУМЕЛА ЧАМУ, АЛЕ ЎСЯ ЗАЛА ПАЧЫНАЕ ПЛЯСКАЦЬ У ДАЛОНІ. Я ЎТРЫМАЎСЯ АД ГЭТАГА ДЗЕЯННЯ. ТАДЫ ЖАНЧЫНА КІРГІЗСКАГА ВЫГЛЯДУ, ЯКАЯ СЯДЗЕЛА ЗА ДВА СВАБОДНЫХ МЕСЦА АД МЯНЕ, ПАДСУНУЛАСЯ, ЗРАБІЛА ВЕЛЬМІ ЗАГАДКАВЫ ВЫРАЗ ТВАРУ І СКАЗАЛА ПА-РУСКУ, БЕЗ НІЯКАГА АКЦЭНТУ: „ХЛОПЦА, ТЫ БЫ ЗВАЛІЎ АДСЮЛЬ, ТУТ МЕСЦЫ ДЗЕЛЯ ЗАПРОШАНЫХ ГАСЦЕЙ." (А ЎСЕ АСТАТНІЯ САМІ ПРЫПЁРЛІСЯ?!)

Я СПРАЧАЦЦА НЯ СТАЎ, ПЕРАСЯЛІЎСЯ НА ДРУГІ РАД, ЧЫМ ТРОШКІ ПАЗЛАВАЎ „НЕЗАПРОШАНЫХ" ДАМ З АДНОЛЬКАВЫМІ ВЫРАЗАМІ НА ТВАРАХ.

ЭЛІТАРНЫ ПЕРШЫ РАД ТАК І ЗАСТАЎСЯ ДА ЗАКАНЧЭННЯ ФІЛЬМА З ЧАТЫРМА СВАБОДНЫМІ КРЭСЛАМІ ПАСЯРЭДЗІНЕ. А МНЕ БЫЛО ДОБРА БАЧНА З МАЙГО „НЕЭЛІТАРНАГА" ДРУГОГА, ЯК ГАЛАВА Ў ТОЙ ЗАПРОШАНАЙ ПАД ЧАС ПРАМОЎ ПАСЛА, МІНІСТРА КУЛЬТУРЫ І АСТАТНІХ, БЫЛА ПАДОБНА ДА ГАЛАВЫ КІТАЙСКАГА БАЛВАНЧЫКА. ЯНА НАТХНЁНА КІВАЛА КОЖНАМУ СЛОВУ СА СЦЭНЫ, НІБЫ ЖАДАЛА СКАЗАЦЬ САБЕ І ІНШЫМ: „ГЛЯДЗІЦЕ ЎСЕ, Я ВЕДАЮ ГЭТЫХ ЛЮДЗЕЙ, Я НАЛЕЖУ ДА ЭЛІТЫ!" АЛЕ Ж МНЕ НА НАІМ „ДРУГІМ" БЫЛО ВЕЛЬМІ СМЕШНА ЎЖО Ў ЯКІ РАЗ ЧУЦЬ ПРА СЯБРОЎСТВА БРАЦКІХ НАРОДАЎ.

АЛЯКСЕЙ.

# ВЫКРЫЦЬЦЕ МАНЫ ВЕГЕТАРЫЯНСТВА АЛЬБО МАНІФЕСТ ЗА РАЎНАПРАЎЕ ЖЫВЁЛ І РАСЬЛІН

Улэўнена, вы чыталі падобныя словы: „Но существует очевидная разница между мирным срыванием яблока и разрезанием горла вопящей коровы. [ ]... растения, которые в равной степени живые, как и животные, обладают гораздо более туманным сознанием и, вследствие этого, чувствуют гораздо меньше боли, чем остальные. [ ]... растение не убито. Намного меньше кармы вовлечено в вегетарианскую диету...”



У-у-у!!! Вы верыце? А я вось не! Хто сказаў, што расьліны адчуваюць менш болю? Чалавек амаль не дасьледуе іх, ён займаецца тым, што бліжэй да цела: жывёламі, самім сабой. Ніхто дакладна ня ведае, што ўяўляюць сабой расьліны. Цалкам магчыма, яны духоўна больш развітая цывілізацыя за нас. Між іншым, гэта адзіныя істоты на Зямлі, якія вырашылі праблему забойства, а чалавек, які „надзелены больш высокім інтэлектам”, працягвае забіваць.

„Мирное срывание яблока”... Калі б дрэва магло даць па шыі, усё было б далёка ня мірна. Як бы вы сябе адчувалі, калі б вам адрэзалі палец (балявыя пачуцьці), а потым у вас на вашах сажралі. Ваша дзіця (маральныя пачуцьці)? Прыемна?!

„Вопящая корова”. А хто сказаў, што дрэва ня можа лямантаваць? Ня чуем — значыць не існуе? Ультрагук мы таксама ня чуем, а ён ёсьць!

...„растение не убито.” Сьмешна! А што тады адбываецца з элементарнай морквай, калі мы яе выдзіраем з глебы і зьядаем?

Дык што, больш ці менш кармы ў вегетарыянскай дыеце?

НЯ БУДЗЬЦЕ КРЫВАДУШНЫМІ!!!

Альбо харчуйцеся інфармацыйным рэсурсам, альбо не рабіце розьніцы паміж жывёламі й расьлінамі!

Яніна

## Болезненные аналогии

Вы когда-нибудь делали
операцию перцу
по удалению зародышей
из перцевого чрева?

Вы ощущали себя
врачом-гинекологом,
делающим своё грязное дело
на глазах у умершего вчера кабачка?

Вы слышали стоны огурцов,
когда их запихивают в банку,
заливая кипятком и облизываясь
в предвкушении зимней трапезы?

Вы тёрли с грохотом морковку
брюхом по железной доске,
пока она не отдаст все соки
в жертву рыжего заката за окном?

Перциковы дети не стали
полноценными перцами для салата-
были ваши руки их кровью испачканы?
Тогда зачем вам вид мёртвого мяса?!!

ФВ



# МІКРАКЛІМАТ

Летам 2001 я правяла тыдзень у г. Пружаны. Чыталі артыкул Хакім Бея „Поэтический терроризм”? Дык вось, я сябе адчувала, як жывое ўвасабленне гэтага самага паэтычнага тэрарызму. Эду, нікога не чапаю, а на мяне ўсе абарочваюцца, як быццам да іх прыехаў Мэрлін Мэнсан. Цяжка. Хай бы ў мяне іракез быў ці яшчэ што-небудзь, а то адзінае, што вылучала - чырвона-сінія чаравікі ды плэйер.

Гэта яшчэ нічога. Прыкольна было, калі на 3 дзень ішла па горадзе і здымала мясцовыя выдатнасьці фотаапаратам зь вялікім аб'ектывам:
- А вы адкуль? А навошта гэта? Здыміце мяне!
- Таварыш, вы ў ландшафт ня ўпісваецеся!
- Які да чорта ландшафт, гэта ж дом!






М-да. Страшна падумаць, што было б, калі б я нафарбавала ногці зялёным лакам і ўвесь час хадзіла ў зялёнай панамцы. Напэўна ў тых, хто мяне пабачыў, была б істэрыка, а астатнія жыхары гораду абмяркоўвалі гэта яшчэ некалькі месяцаў. У выніку зьявілася б мясцовая легенда пра зялёную здань, якая гуляе па вуліцах у сьпякотны жнівень і фатаграфуе старыя дамы, каб зь іх зьехалі апошнія жыльцы.

**ДАВЕДКА:** Насельніцтва - 25000. 2 аптэкі; 11км. ад чыгункі; сельскагаспадарчы тэхнікум; 1 кінатэатр.

Яніна

## ОТЛИЧНЫЙ ДЕПРЕССНЯК



### Которой всё равно...

Смотри сквозь улыбку презрительно!
Сейчас я безверная - все-таки
Смогу на тебя душу выплюнуть;
Не словом скажу - только мыслями,
Несчадно лучами тыко́мыми,
Совсем размягченными, тварями,
Но больно-пребольно скребущими
Сквозь душу твою толстокожую,
Сквозь стену благополучия,
Сквозь ненависть к летнему нежному
Сумеют они процарапаться,
Найдут себе путь прямо до́ сердца.
Какая мне разница, что тебе
Они, эти мысли, наделают!

Лишь летовый бред и неверие
Втираются нынче в компанию!
Глазищи мои обреченные
Прохожих вокруг останавливают!
Наряды пчелино-медовые
Не прячут каменной сырости!
Все то, что зовете вы чувствами
Внутри меня не перевыросло!
Опять я туда перепрыгнула -
В черное, грязное, хмурое!
Спихнуть бы себя в туннельное,
Спасительное, подземное...
Но в мозге стучит:"береги себя!"-
Хорошо, что в трамвай не выплачешь!
Мне холодно. Холодно! ХОЛОДНО!!!
Надеяться некуда, нечего,
Что холод надавит как следует,
И вдрызг разлетится страхомое.

АВ

13-16.07.2001



### Диме

По́этиковость острая
Лезет изо всех дыр и щелей,
Зубами брящает,
Щекочет нервами,
Хочет выбраться наружу -
Нечем, мысли отсутствуют.

По́этиковость мерещится
Во всех вывесках подорожных -
Злая и нахальная,
Но недоношенная.

Пытается проникнуть
В жизненные истории,
В ложку с супом,
Надо ртом занесенную.
Охлаждает жидкость,
Не думая о времени.

Хочет выразиться в чувстве,
В каком - еще не решила.
И в итоге скорее всего
Разразится бранью и гневностью
От долгого вомненичегонеделания.

Жду момента,
Когда наконец выплеснется
Кому-нибудь на душу
Ярким пятном страдания.

И если появится понимание
Или хотя бы желание
Устроить массовые гуляния
На похоронах моего сознания -
Буду довольна собой и жизнью,
А так - не надо подходить ко мне на улицах!

АВ

13-16.07.2001



### Рынак

Часам я бачу сон.
Перада мной у паветры зьзяе Вечнае Жыццё.
На ім вісіць этыкетка з цаной. Цана таксама зьзяе, таму што залатая і вялікая, з доўгімі, шматлікімі нулямі.
Я гляджу на гэтую цану і мне робіцца непамысна, кепска і страшна, бо я ніколі не змагу заплаціць яе. Зрэшты, увогуле мала хто здолее столькі заплаціць.

24.11.2000

МЯМ



### АМАДЖіПП



Вы ведаеце хваробу з назваю "SAP"?
Гэта калі дыхаць - цёмна,
думаць - цёмна,
жыць - цёмна.
Гэта калі не хапае сьвятла і сонца.

А вось паглядзіце:
"Агульная млявасьць,
Абыякавасьць да жыцьця і працілеглага полу."
Таксама дыягназ.
Толькі ён горш,
Таму што гэта калі ўсё роўна:
Думаць ці не, дыхаць ці не, жыць ці не...
Гэта калі ўсё загіне, а ты не заўважаш,
Бо ты зьгінуў раней за ўсіх.

28.11.2000

МЯМ

### Чаму?

Сьнегу ўсё яшчэ няма.
Сьнег падае і тае,
А я іду дамоў.
Мяне ўжо ванітуе
Ад сьвятаў ды размоў.

Чагосьці не хапае
У белай цішыні,
Ня дыхае сьвятая
У гэтай чысьціні.

Я белая, ты белы,
Ўсе белыя вакол...
Не, гэта не ад сьнегу,
Які ляжыць наўкол.

30.11.2000

МЯМ





## слоўнік

**НЕСВАБОДА, -ы, ж** - аднойчы я сустрэла сваю школьную сяброўку. Нам было па дарозе. Мы ехалі ў аўтобусе, размаўлялі пра рэчы, непатрэбныя ні ёй, ні мне. Я стала расказваць анекдот пра Лукашэнку. Анекдот быў сьмешны I, нягледзячы на тое, што пра А.Р.Л., абсалютна апалітычны. Калі я скончыла, сяброўка далікатна ўсьміхнулася, паглядзела па баках і спытала: "А ты не баісься такія анекдоты расказваць?"
лета 2001

**ЩЕПЕТИЛЬНОСТЬ, -сти, ж** - к одному моему приятелю из соседнего дома на несколько дней приехала куча родственников.
- Можно, я у тебя перекантуюсь?
- Да ради бога.
Но из ожидаемой недели ночевал он у меня только первую ночь. Как потом выяснилось, остальные провёл в гараже. На вопрос - почему? - ответ:
- Ну я же тебя компрометирую! Утром уходил, а там бабушки на скамейке. Сидят, смотрят.

**НЕПАСЬЛЯДОЎНАСЬЦЬ, -сьці, ж** - у „экалагічна сьвядомага" музыкі спыталі:
- Будзеш удзельнічаць у зборным канцэрце?
- А ён прысьвечаны экалагічным праблемам?
- Не.
- Тады ня буду. Пайду лепш на матацыкле пакатаюся.

**ПРЫНЦЫПОВАЕ ВЫХАВАНЬНЕ, -ньня, н** - у краму зайшлі маці й маленькая дачка. Маці купіла ўсё, што трэба і пытае дачку:
- Дачушка, што табе набыць?
- Хачу пакемонаў!
- Ніякіх пакемонаў! Ня то зь цябе пакемона зраблю!

**ПАДАЎЛЕНЬНЕ (-ньня, н) ВЕЛІЧЫ** - была я неяк у лесе. Прыгожы лес - бярозы, яліны, сонечны дзень. Хадзіла, хадзіла і напісала верш. Прачытала. Не спадабалася, але вырашыла пакуль што не выкідваць.
Прыехала дадому. Кватэра як кватэра. Зноў прачытала верш. УАЎ! Дык ён жа проста цудоўны!

Яніна



## мыслишь...

Добро должно быть наказуемо,
Иначе оно перестанет
верить в то,
Что оно добро
И изначально предназначено
Ко всеобщему осуждению.
Не думаю, что Христос
Дал бы себя повесить,
Не зная он, что
Войдёт в историю!

Идеалисты должны существовать,
Иначе оптимисты не знали бы,
К чему им стремиться
А пессимисты так и не поняли бы -
Чего же им нехватает
В этой жизни.



АВ



## ПАДМУРАК

Ты связан с HIP-HOP-культурой крепче брачных уз?
Спишь и видишь себя в окружении таких же, как ты?
Забудь про пустое ожидание писем - БУДЬ АКТИВНЫМ!
Неси своё гордое звание рэпера к оперному театру 22.08
В 15.00.
Нам будет о чём поговорить!!!

Задумывая что-то,
Всегда надо учитывать то,
Что что бы ты ни делал
И как бы ни старался -
У природы свои законы,
И она применит их,
Не обращая внимания
На твои благородные цели.
АВ



Адкрою сакрэт. Нам стукнула ў галаву зрабіць зін, бо было 2 задумкі. Ні адна зь іх ня зьдзейсьнілася. Калі першай не шкада (банальнае вью з тусоўкай), то другую - вельмі. Да яе мы прыклалі шмат высілкаў.

Чыталі калі-небудзь аб'явы па ліставаньню ў музычных выданьнях? Бачылі, колькі там жудасна адзінокіх слоў з аднаго горада наконт адной і той жа музыкі? Мы вырашылі зрабіць добрую справу - аб'яднаць людзей. У ліпені найбольш актыўнымі былі рэперы і фанаты Б. Спірс. Як вы лічыце, каго мы выбралі?

Мы вызначылі месца (цэнтр Менска), час (жнівень, серада) і параcсылалі запрашальныя паштоўкі. Як вы ўжо здагадаліся, ніхто не прыйшоў. Чаму? На гэты конт у нас ёсьць свае думкі, але больш цікава даведацца пра вашыя. Пішыце!

**P.S.** Калі вы жадаеце ўбачыць разгорнуты варыянт „ПАДМУРКА", то кажыце пра гэта. Пры адпаведнай колькасьці лістоў паспрабуем яго напісаць.

Яніна



...-БЕЗ ДУШИ ОЧЕНЬ ПЛОХО. МНЕ, ПО КРАЙНЕЙ МЕРЕ.
-А КУДА ТЫ ЕЁ ВАСУНУЛА?
-Я - НИКУДА. ПРОСТО ОНА СВОЕВОЛЬНАЯ. Я ДАЖЕ ПОДОЗРЕВАТЬ СТАЛА, ЧТО ВСЁ-ТАКИ ЭТА ЖИЗНЬ ПОСЛЕДНЯЯ.
-ЗА ТЕБЯ МОГУ ПОРАДОВАТЬСЯ (НО ТОЛЬКО С МОЕЙ ВЫШКИ ЭГОИСТА!), А ПРО СЕБЯ СКАЖУ - Я УВЕРЕН В ТОМ, ЧТО ТЕБЕ ГОВОРИЛ! ПОДТВЕРЖДЕНИЯ И ДОКАЗАТЕЛЬСТВА СЫПЛЮТСЯ НА МЕНЯ УЖЕ ВТОРОЙ ДЕНЬ. СКОРО КОНЕЦ. Я РАД!
-КОГДА И ЧТО ИМЕННО?
-... ..., ... ...!...!...!!!
-ТЫ - НЕ ЦЕЛЫЙ.
-ЗВУЧИТ, КАК... НУ ЗВУЧИТ, В ОБЩЕМ. НАВЕРНОЕ - ГОРДО. НО ЗВУЧИТ. СЫГРАЙ МНЕ ЭТУ ФРАЗУ. А Я БУДУ РАЗМЯКАТЬ ОТ ЧУВСТВА СОБСТВЕННОЙ НЕЗНАЧИТЕЛЬНОСТИ.
-МНЕ ХОТЕЛОСЬ ПОСЛЕДНИХ ДНЕЙ ЖИЗНИ. А ТЕПЕРЬ СТАЛО СТРАШНО.
ТЫ МОГ БЫ ПОЙТИ НОЧЬЮ (ЛУННОЙ) ГУЛЯТЬ ПО ГОРОДУ?
НОЧЬЮ - ЭТО КОГДА ШПЯЮТСЯ ТОЛЬКО ОДИНОКИЕ ПЬЯНИЦЫ.
-1) СЕЙЧАС?
2) С ТОБОЙ?
3) ЭТО НУЖНО?
-НЕ СЕЙЧАС. СО МНОЙ И, МОЖЕТ, ЕЩЁ КЕМ-ТО. ЭТО НУЖНО.

РАЗВЕ МЫ ПОХОЖИ НА ТЕХ, КОГО МОЖНО БЕСПОКОИТЬ?

**анТЫFа футбол зіне у football**

другі нумар ужо даступны за 300 бел.руб.

**Xflies**

Беларусь, Брэсцкая вобл., 225320 Баранавічы, 10-е адз. сув. п/с 86
fooxlie@tut.by

ЛЮДЗІ!!! ПАМІРАЮ БЕЗ МАГЧЫМАСЦІ РЭАЛІЗАВАЦЬ ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ! ПАТРЭБНА ПАЗАЛОЧАНАЯ РАМА (МОЖНА НЯ Ў ЛЕПШЫМ СТАНЕ) ≈ 84×60
220053 МИНСК А/Я 39 БЕЛАРУСЬ

„ВЫГРЕБНАЯ ЯМА". 220053 "МИНСК а/я 39.
НЕ ПИШИ В СТОЛ - НАМ НУЖНЫ ТВОИ ТВОРЕНИЯ!

„LEFT HANDER" "МИНСКИЙ Р-Н БЕЛАРУСЬ г.п. РАТОМКА 223035 а/я 16

„Eh!" БЕЛАРУСЬ, БРЭСЦКАЯ ВОБЛ. 225320. БАРАНАВІЧЫ, 10-е АДДЗ. СУВ. П/С 86

ЛІТАРАТУРНАЯ ГАЗЕТА „LOOK AHEAD", ВЫЙШЛА 2 НУМАРЫ (МАГЧЫМА БОЛЬШ) 231800 ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛ, г. СЛОНІМ-2 П/С 27 !! КОШТ - МАРКА „А" 10руб.

„ПАНИКА В СЕЛЕ" PUNK/HC ANTIFa, COMIX И Т.Д., И Т.П.
ЦЕНА: СНГ-0,5; БЕЛАРУСЬ: 0,4 WORLD - 1$; ОБМЕН!
CONTACT: ул. Минская 39, Д. ЛОМОВИЧИ: ОКТЯБРЬСКИЙ Р-Н, ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛ. 247302
С УХОМУ ДМИТРИЮ

ЧАЛАВЕКІ!!!! ДАПАМАЖЫЦЕ З ТЫРАЖАВАННЕМ! ЧЫМ ТАЎЬНЕЙ, ТЫМ ЛЕПЕЙ! МЫ НЕ БЕЛЫЯ И ПУШЫСТЫЯ! МЫ ЎВОГУЛЕ ЖАДАЕМ КАБ „ВРЕДИНА" БЫЛА БЯСПЛАТНАЙ!



## СУБЪЕКТИВ



„ГОВОРЯЩИЙ ТРОЛЛЕЙБУС" №1,2 DIY.EGO-ZINE. [redacted]
ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЯШЧЭ НЯ ВЫЗНАЧЫЎСЯ СА СВАЁЙ КАСЬМІЧНАЙ АРЫЕНТАЦЫЯЙ. [redacted]
220066 г. МЕНСК, ВУЛ. ТАШКЕНТСКАЯ Д. 18/2 КВ. 49. ДУТЛАЎ АЛЯКСАНДР. [redacted]
BICK MY DUCK@CHAT.RU

ЁСЬЦЬ ТАКІ „ЖУРНАЛ ОДНОГО ЧЕЛОВЕКА" - „СВОЯ СТОРОНА". ЦІ ДОБРЫ ЁН? НАПЭЎНА, ТАК. ЦІ МО ДРЭННЫ? МАГЧЫМА І ГЭТАК. АДЗІНАЕ, ШТО МАГУ СКАЗАЦЬ [redacted] ЦВЁРДА: ЁН ЛІТАРАТУРНЫ. АСТАТНАЕ Ж... ЧЫТАЙЦЕ І ДУМАЙЦЕ СВАІМІ МАЗГАМІ! [redacted]
247400 ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛ., г. СЬВЕТЛАГОРСК, М-Н 6 „А", 3-51 АЛЯКСЕЮ.

# DANKE

НАМ ЛЮБІМЫМ! І ТЫМ АБСТАВІНАМ, ЯКІЯ ПРЫМУСІЛІ НАС НАПІСАЦЬ ЎСЁ ГЭТА.



ПЫТАНЬНЕ ДА ЎСІХ!
ШТО АГУЛЬНАГА ПАМІЖ АЎТОБУСАМ І МЯДЗЬВЕДЗЕМ?






УСЁ АТРЫМАЛАСЯ МЕНАВІТА ТАК, ЯК МЫ ЖАДАЛІ!